Belarus live

# Newsletter

5.02.2007


## ПАЛІТЫКА
- А. Лукашэнка хоча быць добрым вучнем Эўропы
- Прэзыдэнт Ірану прыбудзе зь візытам у Беларусь

## АФІЦЫЙНА
- Лукашэнка прапануе асэнсаваць падзеі

## АПАЗЫЦЫЯ
- Вядомая дата правядзеньня Кангрэсу дэмсілаў
- Мілінкевіч заплаціць 2 тыс. даляраў штрафу
- А. Казулін хоча перадаць дакумэнты па сваёй справе на міжнародную экспэртызу

## ЭКАНОМІКА
- Беларуска-расейскае прадпрыемства на базе "Белтрансгазу" будзе створана раней за намечаны тэрмін
- Новы кошт нафты для Беларусі
- Праз некалькі гадоў Расея можа адмовіцца ад транзыту нафты па тэрыторыі Беларусі

## ГРАМАДЗТВА
- Дзяржава хоча дапамагчы маладым сем'ям
- Упраўленьне справамі прэзыдэнта падоўжыла арэнду БХК
- "Бабруйскі кур'ер" зьнік з газэтных шапікаў
- 725 беларусаў перакрочылі 100-гадовую мяжу

## КУЛЬТУРА
- Рок-каранацыя — 2006
- У Менску — дні габрэйскай кнігі й фатаграфіі


Беларускі прэзыдэнт доўжыць антыкрамлёўскую рыторыку. На тэму дачыненьняў з Расеяй ён выказаўся гэтымі днямі некалькі разоў. Абвінавачаньні на адрас кіраўніцтва Расеі прагучалі падчас выступу перад навукоўцамі, сустрэчаў з лідэрам расейскіх камуністаў Генадзем Зюганавым, галоўным рэдактарам маскоўскай газэты "Завтра" Аляксандрам Прахановым.

На думку афіцыйнага лідэра Беларусі, менавіта Крэмль тарпэдаваў працэс стварэньня так званай "саюзнай дзяржавы". І менавіта адтуль, упэўнены Лукашэнка, прагучалі загады падняць кошт энэрганосьбітаў ды распачаць інфармацыйную вайну.

"Калі нас яшчэ раз паспрабуюць ударыць па адчувальных месцах, мы таксама ведаем гэтыя адчувальныя месцы і ведаем, дзе ўдарыць", — заявіў Лукашэнка 26 студзеня.

Аналітыкі мяркуюць, што ваяўнічая рыторыка, з аднаго боку, закліканая падняць аўтарытэт беларускага кіраўніка як моцнага лідэра ў вачох электарату сваёй краіны ды Расеі. Зь іншага боку, за гэтым стаіць жаданьне напалохаць Маскву адмовай ад хаўрусных дачыненьняў, каб выціснуць з яе болей прэфэрэнцыяў.

У прыватнасьці, адмыслоўцы канстатуюць, што Беларусь дамаглася даволі выгадных кантрактаў з расейскімі кампаніямі на пастаўку нафты з 1 лютага. Аналітыкі зазначаюць, што расейскае кіраўніцтва перад сёлетнімі выбарамі Думы і выбарамі прэзыдэнта ў 2008 годзе ня хоча расчароўваць тую частку суграмадзянаў, што па-ранейшаму марыць пра "братнюю інтэграцыю".

Асабліва шырокі розгалас цягам апошняга тыдня выклікала інтэрвію беларускага прэзыдэнта нямецкай газэце ""Die Welt". Лукашэнка заявіў аб гатоўнасьці да дыялёгу і магчымасьці ўдзелу заходняга капіталу ў прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў.

У выступах апошняга часу беларускі афіцыйны лідэр раз-пораз выкарыстоўвае мэтафару: у замежнай палітыцы мы занадта доўга ляцелі на адным крыле. Цяпер, даводзіць ён, варта рабіць палітыку шматвэктарнай, разьвіваць стасункі з Захадам.

Незалежныя экспэрты робяць выснову, што жорсткі наступ Расеі змушае Лукашэнку карэктаваць курс. Цяпер замест аднабокай арыентацыі на Маскву выбраная мадэль

балянсаваньня між ёй ды Брусэлем (курс Вашынгтону ў дачыненньні да Менску застаецца бескампрамісным). Такую палітыку лавіраваньня між двума полюсамі праводзілі за часамі халоднай вайны Югаславія і Румынія.

На думку аналітыкаў, далейшая трываласьць рэжыму будзе шмат у чым залежаць ад двух чыньнікаў: па-першае, ад моцы ціску Масквы, а па-другое, ад ступені прынцыповасьці Эўразьвязу ў пытаньні аб умовах дыялёгу з Менскам.

Экспэрты прагназуюць, што Менск будзе спрабаваць разбурыць сьцяну ізаляцыі ад Еўропы і скарыстацца яе эканамічным спрыяньнем, у той жа час пазьбягаючы аслабленьня аўтарытарнай сыстэмы.
Найболей імаверныя хіба касьметычныя саступкі, лічаць назіральнікі. Як прыклад яны прыводзяць нядаўняе рашэньне ўладаў адмяніць высяленьне Беларускага Гэльсынскага камітэту з займанага памяшканьня (скасаваную арэнду аднавілі яшчэ на год).

Беларуская апазыцыя перасьцерагае Эўропу ад наіўнасьці і раіць ў якасьці перадумовы дыялёгу дамагацца ад уладаў шэрагу канкрэтных крокаў у бок дэмакратызацыі. У прыватнасьці, гаворка ідзе пра вызваленьне палітычных вязьняў, спыненьне ціску на мэдыі, забеспячэньне умоваў для свабодных выбараў. Гэта даводзіў днямі апазыцыйны лідэр Аляксандар Мілінкевіч, выступаючы ў нямецкім бундэстагу.

Тым часам на кансультацыях у Менску 29 студзеня дасягнутая дамоўленасьць пра візыт Лукашэнкі ў Кіеў у лютым. Імаверна, беларускі кіраўнік мае на мэце дзьве задачы: стварэньне транзытна-энэргетычнага альянсу з Украінай, а таксама скарыстаньне яе пасярэдніцтва дзеля завязваньня перамоваў з Эўразьвязам.

Беларуская апазыцыя вызначылася нарэшце з тэрмінам правядзеньня 2-га Кангрэсу дэмакратычных сілаў — 17—18 сакавіка. А на 25 сакавіка прызначана буйная акцыя пратэсту.

На думку незалежных экспэртаў, працяглая міжусобіца ў кааліцыі палітычных праціўнікаў рэжыму рэзка аслабіла яе патэнцыял, падарвала аўтарытэт у асяродзьдзі шараговых прыхільнікаў пераменаў. Таму ёсьць сумневы, што плянаваная вулічная акцыя атрымаецца масавай.

Звыш усяго, пакуль што падаражэньне энэрганосьбітаў не ўдарыла адчувальна па кішэнях грамадзянаў. Зрэшты, трывожныя сымптомы ёсьць. Падвышаны кошты жыльлёва-камунальных паслугаў. Таксама ўзьнятая стаўка рэфінансаваньня Нацбанку, што можа быць зьвязана з чаканым ростам інфляцыі.

Таксама пацьвярджаецца інфармацыя пра падрыхтоўку ў адміністрацыі прэзыдэнта шэрагу дакумэнтаў, скіраваных на падтрымку прадпрымальніцтва. На 14 лютага прызначана сустрэча высокіх чыноўнікаў з прадстаўнікамі бізнэс-супольнасьці. Экспэрты робяць асьцярожныя прагнозы: улады наважыліся даць пэўную прастору для прадпрымальніцтва, каб ўратавацца ад пагаршэньня эканамічнай сытуацыі. ■

# ПАЛІТЫКА

## А. Лукашэнка хоча быць добрым вучнем Эўропы

**У інтэрвію нямецкай газэце "Die Welt" беларускі лідэр прызнаўся, што не выключае ўвядзеньня ў Беларусі эўра, а таксама стратэгічнага саюзу з Польшчай, Украінай і Прыбалтыкай.**

Беларускія СМІ апублікавалі інтэрвію Аляксандра Лукашэнкі, якое ён даў папулярнаму нямецкаму выданьню "Die Welt". Паводле словаў кіраўніка краіны, падчас энэргетычнага канфлікту з Расеяй, Беларусь адчула як моцна яна патрабуе замежных інвэстыцыяў.

Лукашэнка папрасіў адкрыць эўрапейскі рынак для беларускіх тавараў, а таксама скасаваць забарону на ўезд беларускіх чыноўнікаў у Эўропу. У інтэрвію прэзыдэнт зазначаў, што канцлер Нямеччыны Ангела Мэркэль як кіраўнік Эўразьвязу зьвяртае мала ўвагі на Беларусь і выказаў

спадзяваньне на хуткую зьмену склаўшайся сытуацыі.

А. Лукашэнка таксама паведаміў, што ён зьяўляецца самым адкрытым прэзыдэнтам у сьвеце, што ў Беларусі няма праблемаў са свабодай слова, а апазыцыя не перасьледуецца з боку ўлады.

## Прэзыдэнт Ірану прыбудзе зь візытам у Беларусь

**Прэзыдэнт Ірану Махмуд Ахмадынежад прыбудзе зь візытам у Беларусь у першай палове бягучага году.**

Пра гэта паведамляюць міжнародныя інфармацыйныя агенцтвы са спасылкай на крыніцы ва ўрадзе Ісламскай Рэспублікі Іран.

У Тэгеране знаходзіцца міністар замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў. Гэта другі беларускі міністар, які наведаў Іран цягам бліжэйшага часу. Як паведамлялася, на мінулым тыдні Тэгеран наведаў кіраўнік абароннага ведамства РБ Леанід Мальцаў.

Падчас перамоў Сяргея Мартынава з прадстаўнікамі ўлад Ірану, у тым ліку з прэзыдэнтам Ахмадынежадам, закраналіся пытаньні беларуска-іранскага супрацоўніцтва, перш за ўсё эканамічнага характару.

# АФІЦЫЙНА

## Лукашэнка прапануе асэнсаваць падзеі

**Прэзыдэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў спрэчцы паміж Беларусьсю й Расеяй настаў час і аднаму, і другому бакам "астыць, асэнсаваць падзеі, што адбываюцца, і не нагнятаць абстаноўку ў тым напрамку, адкуль немагчыма будзе выйсьце".**

"Нам гэта бойка не патрэбна й не таму, што мы слабыя, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гатовы да ўсяго і ўсё вытрымаем".

Агенцтва БЕЛТА паведамляе, што, паводле слоў лідэра краіны, "беларускі народ ні ў чым не правініўся перад Расеяй, мы сьвята выконваем усе дамоўленасьці".

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз паўтарыў, што Беларусь ніколі ня ўвойдзе ў склад Расеі, пра што намякалі крамлёўскія палітыкі.

"Калі нас яшчэ раз паспрабуюць ударыць па адчувальных месцах, мы таксама ведаем гэтыя адчувальныя месцы й ведаем, дзе ўдарыць", — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

# АПАЗЫЦЫЯ

## Вядомая дата правядзеньня Кангрэсу дэмсілаў

**Кангрэс дэмакратычных сілаў адбудзецца 17—18 сакавіка.**

Такое рашэньне было прынятае на паседжаньні Палітрады аб'яднаных дэмакратычных сілаў 31 студзеня.

Дату правядзеньня Кангрэсу ў сярэдзіне сакавіка падтрымала 8 чальцоў Палітрады. Лідэр руху "За свабоду" Аляксандар Мілінкевіч не прыймаў удзелу ў згаданым паседжаньні.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька зазначыў, што да правядзеньня Кангрэсу павінны быць гатовыя праект так званай "Малой Канстытуцыі" ды плятформа з адказамі на пытаньні, якія найбольш хвалююць грамадзтва. На думку кіраўніка партыі, дадзеныя дакумэнты павінны стаца падставай, зь якой апазыцыя пойдзе на выбары дэпутатаў у парлямэнт 2008 году.

Палітрада зацьвердзіла рашэньне аб правядзеньні 25 сакавіка масавай вулічнай акцыі.

## Мілінкевіч заплаціць 2 тыс. даляраў штрафу

**Лідэр руху "За Свабоду" Аляксандар Мілінкевіч аштрафаваны на 4,64 млн. беларускіх рублёў за перасячэньне дзяржаўнай мяжы па чужых дакумэнтах.**

29 лістапада, вяртаючыся з саміту NATO ў Рызе, Аляксандар Мілінкевіч быў затрыманы памежнікамі ў Нацыянальным аэрапорце "Менск-2".

Высьветлілася, што Аляксандар Мілінкевіч пры перасячэньне беларуска-латвійскай мяжы паказаў супрацоўнікам памежных службаў пашпарт свайго сына, таксама Аляксандра. Вяртаючыся назад, ён

прадставіў свой ўласны пашпарт. Палітык тлумачыць гэта памылкай, у той час як старшыня памежных войскаў Беларусі Аляксандар Паўлоўскі пераканаць, што Мілінкевіч сьвядома прадставіў чужы пашпарт.

Аляксандар Млінкевіч не прысутнічаў у судзе па гэтай справе, але мае намер падаць апэляцыю, паколькі лічыць, што інцындэнт зьяўляецца памылкай памежнікаў.

## А. Казулін хоча перадаць дакумэнты па сваёй справе на міжнародную экспэртызу

**Экс-кандыдат у прэзыдэнты й старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі" Грамада" Аляксандар Казулін, падчас размовы са сваім адвакатам, выказаў гатоўнасьць перадаць дакумэнты па сваім асуджэньні на міжнародную экспэртызу.**

25 студзеня ў віцебскай калёніі адбылася сустрэча Аляксандра Казуліна й ягонага адваката Ігара Рынкевіча. Свайму абаронцу былы кандыдат у прэзыдэнты паведаміў, што калі Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы сумняецца ў палітычнай матываванасьці асуджэньня Казуліна, то ён пагаджаецца перадаць у карыстаньне гэтай структуры ўсе неабходныя дакумэнты.

А. Казулін выказаў сумнеў, што беларускія ўлады дазволяць эўрапейскім арганізацыям правесьці экспэртызу па пытаньні працэсаў, якія Эўропа лічыць палітычна матываванымі.

Зараз беларускі палітвязень рыхтуе скаргу ў Вярхоўны суд, пасьля чаго мае намер перадаць усе дакумэнты эўрапейскім экспэртам для аналізу, каб у выніку ўсе факты трапілі ў Раду ААН па правох чалавека.

## Аляксандр Казулін сустракаецца зь сям'ёй

**Лідэр Сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада", прафэсар Аляксандр Казулін сустракаецца з жонкай Ірынай і дзьвюма дочкамі, Вольгай і Юліяй.**

Гэта першая працяглая сустрэча экс-кандыдата ў прэзыдэнты з блізкімі з моманту знаходжаньня ў турме. Прафэсар Казулін правядзе з жонкай і дочкамі 3 дні. Сустрэча пачалася ў суботу, а завершыцца у панядзелак, 29 студзеня.

Ірына Казуліна сказала журналістам, што яна й дочкі падрыхтавалі ў калёнію любімыя стравы палітыка. Гэта вэгетарыянская ежа, паколькі Казулін не есьць мяса. Акрамя гэтага, палітык пастунова выходзіць з галадоўкі, якая працягвалася 53 дні.

Тым часам Аляксандр Казулін сказаў, што ў Беларусі неабходна стварыць Урад Народнага Даверу. У яго склад увайшлі б, паводле палітыка, легітымныя структуры, напрыклад, дэпутаты Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, чальцы Канстытуцыйнага суду й прадстаўнікі Кангрэсу дэмакратычных сіл.

# ЭКАНОМІКА

## Беларуска-расейскае прадпрыемства на базе "Белтрансгазу" будзе створана раней за намечаны тэрмін

**Беларуска-расейскае сумеснае прадпрыемства на базе ААТ "Белтрансгаз" будзе створанае раней за намечаны тэрмін.**

Аб гэтым журналістам паведаміў намесьнік міністра эканомікі Беларусі Алег Мельнікаў.

Завяршыць стварэньне СП плянавалася да 1 чэрвеня 2007 года. "Я думаю, што гэта адбудзецца раней", — сказаў намесьнік міністра эканомікі.

Паводле яго слоў, да гэтага часу ўсе прынцыповыя ўмовы па гэтаму дагавору ўзгоднены, засталося вырашыць тэхнічныя пытаньні, зьвязаныя з заключэньнем самога пагадненьня.

Намесьнік міністра эканомікі дадаў, што цяпер ідзе падрыхтоўка неабходных дакумэнтаў, разгляд іх урадамі дзьвюх краін. Затым адбудзецца працэдура перадачы 50 працэнтаў акцый расейскаму боку. Як ужо паведамлялася, 31 сьнежня 2006 года Беларусь і Расея падпісалі пратакол аб стварэньні сумеснага прадпрыемства на базе ААТ "Белтрансгаз", згодна зь якім "Газпром" выкупіць 50 працэнтаў акцый "Белтрансгазу".

## Новы кошт нафты для Беларусі

**З 1 лютага Беларусь пачне аплату за расейскую нафту паводле новай формулы.**

Аплата за сыравіну будзе ажыцьцяўляцца на падставе сусьветных цэнаў, але Беларусь заплаціць за кожную тону напалову менш, чым яе суседзі.

Такая сытуацыя абумоўленая тым, што Беларусь ня будзе плаціць за транспарціроўку нафты. У выніку сярэдні кошт нафты для краіны складзе каля 225 даляраў ЗША. Адпаведная дамова падпісаная з усімі пастаўшчыкамі нафты ў Беларусь, што гарантуе стабільнасьць коштаў. У камісію, якая займаецца ацэнкай кошту "чорнага золата" для Беларусі, акрамя расейскіх спэцыялістаў, уваходзяць і прадстаўнікі "Белнафтахіму".

## Расея можа адмовіцца ад транзыту па тэрыторыі Беларусі

**Кампанія "Транснафта" разглядае ў пэрспэктыве магчымасьць павялічыць амаль удвая магутнасьць Балтыйскай трубаправоднай сыстэмы — заявіў у аўторак віцэ-губэрнатар Ленінградскай вобласьці Грыгорый Двас.**

Павышэньне магутнасьці дазволіць амаль поўнасьцю адмовіцца ад транзытных паслуг Беларусі.

На прэс-канфэрэнцыі ў Санкт-Пецярбурзе Двас сказаў: "па маёй інфармацыі, разглядаюцца два варыянты павелічэньня магутнасьці БТС — да 120 млн тон і да 150 млн тон нафты ў год". Сёньня БТС дазваляе перапампоўваць каля 80 млн тон расейскай нафты да тэрміналу ў Прыморску — расейскім порце ў Фінскім заліве — паведамляе партал Хартыя97.

У кампаніі "Транснафта" заяўлялі, што пакуль што працы па пашырэньні магутнасьці не пачаліся ў сувязі з адсутнасьцю рашэньня расейскага ўраду. На рэалізацыю праекту, па ацэнках спэцыялістаў, патрэбныя 2-3 гады.
Калі БТС будзе пашырана да 150 млн тон у год, то амаль увесь транзыт расейскай нафты праз Беларусь можа быць перанесены ў БТС. Штогод па тэрыторыі Беларусі перапампоўваецца да 80 млн тон расейскага паліва. Па словах прэзыдэнта Расеі, у выніку паставак таннай нафты ў Беларусь Расея страчвае 2,5 млрд даляраў кожны год. "Адмовіцца ад такой субсыдыі Менск не намераны, мі нават пасьля павышэньня коштаў нафты знойдзе спосаб, каб вярнуць грошы, напрыклад, увядзе плату за зямлю, па якой праходзіць "труба" — мяркуе аналітык Веніямін Окса з арганізацыі "Аб'яднаныя стратэгічныя кансультанты". Таму пашырэньне трубы акупіцца цягам некалькіх гадоў.

## Нафта з Вэнэсуэлы хутка будзе ў Беларусі

**На працягу трох наступных год Беларусь пачне актыўна выкарыстоўваць вэнэсуэльскую нафту. Пра гэта сёньня заявіў віцэ-прэм'ер Беларусі Ўладзімір Сямашка.**

Плянуецца, што ўжо неўзабаве распачнецца сумесная з Вэнэсуэлай праграма па здабычы нафты ў гэтай лацінаамэрыканскай краіне. Адпаведныя дамоўленасьці былі падпісаныя яшчэ ў мінулым годзе падчас візыту беларускай дэлегацыі ў Каракас. На моцы падпісаных дамоўленасьцяў "Беларусьнафта" ў хуткім часе распачне пошукавыя працы нафтарадовішчаў.

Беларусь, дзякуючы ўзгаданым пагадненьням, зможа здабываць каля 10 млн. тонаў у год. Агульны аб'ём нафты ў дадзенай зоне здабычы складае каля 200 млн. тонаў. Уладзімір Сямашка таксама зазначыў, што расейская нафта будзе разбаўляцца вэнэсуэльскай.

## Цэны на жыльлё ў Беларусі імкліва растуць

**Цэны на жыльлё ў Беларусі імкліва растуць. Асабліва адчувальна гэта ў Менску, дзе квадратны мэтар сярэдняй аднапакаёвай кватэры каштуе ўжо каля 1400 даляраў.**

Паўсюль па краіне беларусы аддаюць перавагу менавіта аднапакаёўкам, што адбываецца праз падаражаньне камунальных паслугаў. Але таксама праз выхад на рынак маладога пакаленьня, што добра зарабляе або мае свой бізнэс, паведамляе партал nn.by.

Адной з прычынаў росту цэнаў на жыльлё, як на першасным, так і на другасным рынках, зьяўляецца актыўнае разьвіцьцё сыстэмы жыльлёвага крэдытаваньня. Паводле зьвестак Міністэрства архітэктуры й будаўніцтва, у Менску знаходзяцца на

ўліку 170 тысячаў сем'яў, што маюць патрэбу ў засяленьні. У хуткім часе ў парлямэнт мусіць патрапіць законапраект, які прадугледжвае стварэньне сыстэмы будаўнічых ашчаджэньняў.

Калі закон будзе ўхвалены, пэўная катэгорыя грамадзянаў зможа адкладаць грошы на адмысловым банкаўскім рахунку й потым атрымаць ільготны крэдыт на жыльлё.

На сёньня цана аднаго "сацыяльнага" квадратнага мэтру ў Беларусі складае каля 400 даляраў пры сярэднім заробку 270 даляраў.

# ГРАМАДЗТВА

## Дзяржава хоча дапамагчы маладым сем'ям

**У Палату прадстаўнікоў паступіў праект, які прадугледжвае павелічэньне дапамогі пры нараджэньні першага дзіцяці да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму.**

Пры нараджэньні другога й наступных — да 7 бюджэтаў. Пра гэта паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Канаплёў. Паводле ягоных словаў, дэмаграфічная праблема зьяўляецца сёньня ў Беларусі адной з самых актуальных.

Адпаведна для таго, каб беларусы захаваліся як нацыя, іх колькасьць павінна павялічыцца як мінімум у два разы. Канаплёў адзначыў, што апошнім часам у нашай краіне расьце лік шлюбаў і паменшылася колькасьць разводаў.

Летась упершыню за 17 гадоў быў адзначаны рост нараджальнасьці. На сёньняшні дзень доля сем'яў з адным дзіцем у Беларусі складае 59%

Упраўленьне справамі прэзыдэнта падоўжыла арэнду БХК

Упраўленьне справамі прэзыдэнта падоўжыла дамову арэнды памяшканьня з Беларускім Хэльсынскім Камітэтам. Па інфармацыі партала Хартыя'97, старшыня БХК Тацьцяна Працька сустрэлася з прадстаўніком Упраўленьня справамі прэзыдэнта Міхаілам Бяляевым. Дамова арэнды на офіс па адрасе вул. Карла Лібкнехта 67 падоўжана на год. Такім чынам цяпер у арганізацыі ёсьць юрыдычны адрас і ёй не пагражае ліквідацыя.

Прычына падаўжэньня дамовы, на думку Працькі, гэта заява ў абарону БХК, зробленая днямі Эўразьвязам ды дзярждэпартамэнтам ЗША.

Нагадаем, у сьнежні мінулага году Галоўнае гаспадарчае ўпраўленьне паведаміла БХК аб скасаваньні дамовы арэнды офіснага памяшканьня й загадала яго вызваліць да 20 студзеня 2007 году. У лістападзе мінулага году суд Менску вырашыў канфіскаваць апісаную маёмасьць Камітэту. Праваабаронцаў абвінавацілі ў няўплаце падаткаў у межах праграмы дапамогі TACIC.

## "Бабруйскі кур'ер" зьнік з газэтных шапікаў

**Прадпрыемства "Магілёўсаюздрук" ад сёньняшняга дня адмовілася распаўсюджваць недзяржаўную газэту "Бабруйскі кур'ер". Афіцыйная прычына — нізкая рэалізацыя выданьня.**

Бабруйскі філіял дзяржаўнага прадпрыемства "Магілёўсаюздрук" зь 1-га лютага скасаваў дамову на распаўсюд незалежнага выданьня праз сетку шапікаў. У афіцыйным лісьце кіраўніца філіялу Тацьцяна Бежалева патлумачыла адмову нізкай рэалізацыяй і высокім адсоткам сьпісаньня "Бабруйскага кур'еру". Цяпер выданьне можна набыць толькі ў рэдакцыі альбо ў прыватных гандляроў.

Штомесяц праз шапікі распаўсюджвалася больш за 4 тысячы асобнікаў газэты. Там жа прадаюцца некаторыя дзяржаўныя выданьні са значна меншымі розьнічнымі накладамі. Як паведамілі ў рэдакцыі, раней, пры неабходнасьці, колькасьць асобнікаў заўсёды ўзгаднялася й канфліктных сытуацыяў не ўзьнікала. Выконваючы абавязкі галоўнага рэдактара "Бабруйскага кур'еру" Анатоль Санаценка лічыць нагоду скасаваньня дамовы фармальнай. Гэта традыцыйная палітыка, якую праводзяць беларускія ўлады, каб задушыць незалежную прэсу, мяркуе журналіст.

"Бабруйскі кур'ер" — адна з найстарэйшых газэтаў Магілёўшчыны, першы нумар якой зьявіўся у 1914 годзе, пазьней выданьне ліквідавалі. 16 гадоў таму "Бабруйскі кур'ер" зноў пачаў выходзіць.

725 беларусаў перакрочылі 100-гадовую мяжу

Сярод доўгажыхароў — 88 мужчынаў і 637 жанчынаў. Ва ўзроставай групе звыш 110 гадоў няма мужчынаў.

Найстарэйшай жыхаркай Беларусі зьяўляецца менчанка Ганна Барысевіч. Летась яна адзначыла сваё 118-годьдзе. Найбольш доўгажыхароў налічваецца на Гарадзеншчыне — 182 чалавекі, найменш іх на Магілёўшчыне — толькі 65. У сталіцы жывуць 52 чалавекі, якім больш за 100 гадоў.

# КУЛЬТУРА

## Рок-каранацыя — 2006

**25 лютага ў Канцэртнай залі "Менск" адбудзецца цырымонія ўзнагароджаньня лепшых рок-гуртоў Беларусі.**

Журы, у склад якога ўвайшлі каля 30 чалавек, неўзабаве распачынае працу па абраньні найлепшага выканаўцы, гурту, прадзюсара, кліпу, альбому й гэтак далей. У гэтым годзе фармат "Рок — каранацыі" будзе значна пашыраны. Акрамя рок-камандаў, удзел у конкурсе бяруць хіп-хоп выканаўцы, поп-рок, а таксама цяжкой музыкі. Вядучымі цырымоніі будуць тэлевядучы Віктар Маліноўскі й радыёвядучая Яна Каменская. Рэжысэр-пастаноўшчыкам шоў зьяўляецца рэжысэр Рускага драматычнага тэатру Вітаўтас Грыгалюнас.

У Менску — дні габрэйскай кнігі й фатаграфіі

Выстава "Дні габрэйскай кнігі" і экспазыцыя работ вядомых ізраільскіх фатографаў, якія праходзяць з 30 студзеня па 4 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дапамогуць беларусам больш даведацца аб Ізраілі. Гэтыя мерапрыемствы будуць імпульсам для актывізацыі двухбаковых кантактаў. Такую думку выказаў амбасадар Ізраіля у Беларусі Зееў бен Ар'е.

У кніжнай выстаўцы прымае ўдзел каля 20 ізраільскіх выдавецтваў. Сярод іх буйнейшыя выдавецтвы, якія выпускаюць кнігі на іўрыце і на рускай мове, а таксама выдавецтвы, што спэцыялізуюцца ў выдаваньні кніг на рускай мове, выдавецтвы рэлігійнай літаратуры. Свае кнігі прадстаўляюць расейскія выдавецтвы й беларускае выдавецтва "МЕТ". Паралельна з выстаўкай кніг пройдзе экспазіцыя "Пераводныя карцінкі", дзе будзе прадстаўлена творчасць вядомых ізраільскіх фотамастакоў Юліі Камісараф і Давыда Дэктара. Іх работы знаёмяць з калейдаскопам ізраэльскага жыцьця — гэта сэрыя вобразаў, выхапленых з рэальнасьці. Пры несумненнай творчай сталасьці й аўтаномнасьці гэтыя два майстры цудоўна дапаўняюць адзін аднаго.

У рамках дзён 31 студзеня й 1 лютага прэзэнтуецца кніга Этгара Керэта ў перакладах на беларускую Паўла Касьцюкевіча клясычным правапісам. Імпрэзы пройдуць у Нацыянальнай бібліятэцы і Габрэйскім культурным цэнтры.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейска моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, нямецкай, французскай, польскай, беларускай, расейскай ды ўкраінскай мовах можна замовіць на сайце.